УДК 94(476)

**І. А. Андарала**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

## СЯРЭДНЯЯ НАВУЧАЛЬНАЯ ШКОЛА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ

Вайна і акупацыя тэрыторыі Беларусі нямецкімі захопнікамі нанеслі вялікі ўрон сістэме агульнай сярэдняй адукацыі рэспублікі. Каб падняць з руін і попелу разбураную вайной агульнаадукацыйную школу, патрэбны былі істотныя намаганні партыйна-савецкага кіраўніцтва ўсіх узроўняў, органаў адукацыі і усяго насельніцтва рэспублікі. У дадзеным артыкуле аўтар на аснове вывучэння архіўных крыніц, пераважна раней не апублікаваных, у рэчышчы комплекснага падыходу аналізуе стан агульнаадукацыйнай школы рэспублікі ў першыя пасляваенныя гады, акцэнтуючы ўвагу на праблемах будаўніцтва і рамонту школьных будынкаў, аднаўлення сеткі школ, росту вучнёўскага кантынгенту, забеспячэння школ настаўніцкімі кадрамі, выканання закону аб усянавучы.

Аналіз архіўных матэрыялаў дае падставу канстатаваць, што аднаўленне сярэдняй агульнаадукацыйнай школы ў першыя пасляваенныя гады разглядалася партыйна-савецкім кіраўніцтвам рэспублікі як найважнейшая дзяржаўная задача палітычнага, гаспадарчага і культурнага значэння. Гістарычныя факты сведчаць, што ў першыя пасляваенныя гады раённымі партыйна-савецкімі органамі, раённымі і гарадскімі аддзеламі народнай адукацыі, грамадскасцю, настаўнікамі і вучнямі было шмат зроблена для аднаўлення нармальнай работы агульнаадукацыйных школ рэспублікі, але пытанні будаўніцтва і рамонту школ, іх матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння, усянавуча, забеспячэння школ настаўніцкімі кадрамі заставаліся актуальнымі і патрабавалі свайго вырашэння.

**Ключавыя словы:** адукацыя, школа, вучэбна-матэрыяльная база, педагагічныя кадры, усянавуч.

**Для цитирования:** Андарала І. А. Сярэдняя навучальная школа Беларусі ў першыя пасляваенныя гады // Труды БДТУ. Сер. 6, Гісторыя, філасофія. 2021. № 1 (245). С. 85–90.

**I. A. Andarala**
Belarusian State Technological University

## SECONDARY EDUCATIONAL SCHOOL OF BELARUS IN THE FIRST POST-WAR YEARS

The war and the occupation of the territory of Belarus by the German invaders caused great damage to the system of general secondary education of the republic. Significant efforts of the party-Soviet leadership of all levels, educational bodies and the entire population of the republic were needed to raise the war-torn secondary school from ruins and ashes. In this article, the author analyzes the state of secondary schools in the first postwar years, focusing on the problems of construction and repair of school buildings, restoration of the school network, growth of the student body, provision of schools personnel compliance with the law on omniscience.

The analysis of archival materials gives grounds to state that the restoration of the secondary school in the first postwar years was considered by the party-Soviet leadership of the republic as the most important state task of political, economic and cultural significance. Historical facts show that in the first postwar years the district party-Soviet bodies, district and city departments of public education, the public, teachers and students did much to restore the normal operation of secondary schools, but the construction and repair of schools, their logistics, universally, the provision of schools with teaching staff remained relevant and demanded a solution.

**Key words:** education, school, educational and material base, teaching staff, general education.

**For citation:** Andarala I. A. Secondary educational school of Belarus the first post-war years. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2021, no. 1 (245), pp. 85–90 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Ва ўмовах інавацыйнага развіцця нацыянальнай сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі актуалізавалася праблема даследавання яе гістарычнага мінулага з мэтай усебаковага вывучэння і аб’ектыўнай ацэнкі пазітыўнага і негатыўнага вопыту рэалізацыі школьнай палітыкі ў рэспубліцы ў савецкі перыяд.

Гістарыяграфічны пошук сведчыць аб тым, што праблема развіцця агульнаадукацыйнай школы Беларусі ў пасляваенны савецкі перыяд заўсёды

была ў полі зроку навукоўцаў. Даследаванню генезісу школьнай адукацыі БССР прысвечаны працы Н. М. Ганушчанкі, І. М. Ільюшына, М. С. Крата, М. Г. Мінкевіча, В. П. Паўлоўскай і інш. Аднак стан школьнай адукацыі рэспублікі ў першыя пасляваенныя гады айчыннымі навукоўцамі асвятляецца фрагментарна з мэтай паказу дасягненняў рэспублікі ў культурнай рэвалюцыі пад кіраўніцтвам КПСС.

Аналіз складанага і супярэчлівага працэсу пасляваеннага аднаўлення школьнай адукацыі БССР з сучасных пазіцый патрабуе асэнсаваць яго крытычна, аб’ектыўна, без ідэалагічнай заангажыраванасці, на аснове існуючых архіўных крыніц.

**Асноўная частка.** Вайна і акупацыя тэрыторыі Беларусі нямецкімі захопнікамі нанеслі вялікі ўрон сістэме агульнай сярэдняй адукацыі рэспублікі. Сетка школ, што функцыянавала ў даваенныя гады, была фактычна знішчана. У такіх раёнах, як Бягомльскі і Плешчаніцкі Мінскай вобласці, Лельчыцкі і Капаткевіцкі Палескай вобласці, Суражскі і Лёзненскі Віцебскай вобласці, акупанты спалілі ўсе школьныя будынкі [1, с. 12].

Аднаўленне школьнай гаспадаркі і ўзнаўленне вучэбных заняткаў у школах пачалося ўжо восенню 1943 г., калі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў былі вызвалены толькі ўсходнія раёны рэспублікі.

Дзякуючы вялікаму энтузіязму грамадскасці, настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў, у асноўным праз рамонт і прыстасаванне ўцалелых памяшканняў, а ў сельскай мясцовасці нават праз выкарыстанне зямлянак і бліндажоў у вызваленых раёнах на працягу першага пасляакупацыйнага вучэбнага года атрымалася аднавіць дзейнасць значнай колькасці агульнаадукацыйных школ, у асноўным пачатковых.

У наступным 1944/1945 вучэбным годзе аднаўленне школьнага навучання ў рэспубліцы ажыццяўлялася па трох асноўных накірунках: пашырэнне сеткі школ; выкананне закону аб усянавучы; забеспячэнне школ настаўніцкімі кадрамі.

Аднак, як вынікае з сакрэтнай пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б № 1163-292с «Аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы школ да 1945/1946 вучэбнага года», прынятай у жніўні 1945 г., нягледзячы на ўсе намаганні партыйна-дзяржаўных структур, абласных, раённых аддзелаў народнай адукацыі, удзел шырокіх слаёў грамадскасці, вырашыць усе задачы па аднаўленні школьнай адукацыі рэспублікі ва ўмовах вострага дэфіцыту фінансавых, матэрыяльных і людскіх рэсурсаў да пераможнага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны так і не атрымалася [2, л. 157–160].

Менавіта таму СНК БССР і ЦК КП(б)Б напярэдадні першага пасляваеннага вучэбнага года быў распрацаваны і прыняты шырокамаштабны комплекс мерапрыемстваў па падрыхтоўцы школ да пачатку 1945/1946 вучэбнага года. Пастанова прадугледжвала канкрэтныя даручэнні наркамасветы, іншым наркаматам і ведамствам, абласным і раённым выканкамам Саветаў дэпутатаў працоўных па выкананні прынятага плана мерапрыемстваў [2, л. 157–160].

Трэба адзначыць, што ўжо ў летнія месяцы 1945 г. мясцовыя органы ўлады і народнай адукацыі здолелі правесці некаторую работу па падрыхтоўцы школ рэспублікі да пачатку першага пасляваеннага вучэбнага года.

Як адзначалася ў пастанове калегіі Народнага Камісарыята асветы рэспублікі «Аб выніках работы школ і органаў народнай асветы за першае паўгоддзе 1945/1946 вучэбнага года і задачах на другое паўгоддзе», прынятай 26 лютага 1946 г., да 1 верасня 1945 г. была перагледжана, упарадкавана і значна пашырана сетка школ, праведзена пэўная работа па рамонце і абсталяванні школьных будынкаў і памяшканняў, павелічэнні фонду школьных падручнікаў, вучэбна-наглядных дапаможнікаў і пісьмовых прылад, паляпшэнні колькаснага і якаснага складу настаўніцкіх кадраў [3, л. 30].

Як вынікала з прынятага дакумента, найбольш істотныя поспехі пры падрыхтоўцы школьнай адукацыі рэспублікі да пачатку першага пасляваеннага вучэбнага года былі дасягнуты ў пашырэнні сеткі школ, павелічэнні кантынгенту навучэнцаў у іх, асабліва ў сямігадовых і сярэдніх школах, і ў паляпшэнні забяспечанасці школ настаўнікамі.

Сапраўды, колькасць агульнаадукацыйных школ на пачатак 1945/1946 вучэбнага года ў параўнанні з папярэднім годам павялічылася з 10 251 да 10 965, або на 714 школ ( на 7%), у тым ліку: пачатковых – з 8470 да 9001 (на 531, або 6,3%), сямігадовых – з 1518 да 1640 (на 122, або на 8%) і сярэдніх – з 263 да 324 (на 61, або на 23%) [4, л. 50]. Аднак неабходна адзначыць, што план пашырэння сеткі школ, даведзены рэспубліцы сакрэтнай пастановай СНК СССР № 400-120 с.с. ад 25 сакавіка 1945 г. «Аб дзяржаўным плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі на 1945 г.» [4, л. 15], аказаўся выкананым толькі ў частцы агульнай колькасці школьных вучэбных устаноў, прычым за кошт адкрыцця звышпланавай колькасці пачатковых школ. Што тычыцца сямігодак, то, у адпаведнасці з адзначаным дзяржаўным планам, неабходна было стварыць 1990 такіх школ, а было адкрыта толькі 1640. Сетку сярэдніх школ рэспублікі планавалася давесці да 350, а было адкрыта 324 школы [4, л. 15]. Такім чынам,

дзяржаўны план па адкрыцці ў рэспубліцы да пачатку 1945/1946 вучэбнага года колькасці сямігадовых і сярэдніх школ аказаўся істотна недавыкананы. Гэта можна патлумачыць тым, што раённыя аддзелы народнай адукацыі, вымушаныя выконваць даведзеныя колькасныя паказчыкі па адкрыцці новых школ, аддавалі перавагу пачатковым, якія было зручней адкрыць. Што да выканання планавых заданняў па адкрыцці новых сямігадовых і сярэдніх школ, то ў многіх раёнах да гэтага падыходзілі фармальна, без уліку іх рэальнай неабходнасці. У выніку сямігодкі часта знаходзіліся ў блізкай адлегласці адна ад другой пры напаўняльнасці класаў у іх толькі па 5–11 чалавек [3, л. 51].

Кантынгент навучэнцаў, якія наведвалі ўсе тыпы агульнаадукацыйных школ рэспублікі ў 1945/1946 вучэбным годзе, у параўнанні з папярэднім вучэбным годам павялічыўся з 1 052 735 да 1 328 819, або на 276 084 чалавекі (на 26,2%), у тым ліку: у 1–4 класах – з 936 163 да 1 145 634 чалавек (на 209 466 чалавек, або на 22,3%), у 5–7 класах – з 108 044 да 165 825 чалавек (на 77 781 чалавек, або на 72%) і ў 8–10 класах – з 8 523 да 17 360 чалавек (на 8837 чалавек, або на 103%). [3, л. 50]. Зноў трэба падкрэсліць, што ўстаноўлены раней адзначанай сакрэтнай пастановай СНК СССР [4, л. 15] план па вучнёўскім кантынгенце адукацыйная сістэма рэспублікі ў цэлым выканала і нават крыху перавыканала. Як і ў выпадку з сеткай школ, гэта ўдалося вырашаць за кошт колькасці навучэнцаў 1–4 класаў. Даведзеныя планы ж па колькасці навучэнцаў у 5–7 і 8–10 класах аказаліся істотна недавыкананымі. У 5–7 класах, згодна з планам, павінна было вучыцца 205 000 чалавек, а на 1 верасня 1945 г. села за парты толькі 165 825 (менш на 39 175 чалавек, або на 20%). У 8–10 класы планавалася прыняць 22 000 вучняў, а да вучобы прыступілі толькі 17 360 чалавек, што склала 78,5% ад плана [4, л. 15]. Галоўнай прычынай невыканання планавых паказчыкаў, як вынікае з архіўных дакументаў, з'яўлялася нездавальняючая работа мясцовых улад, органаў народнай адукацыі, школ па выкананні закона аб усеагульным навучанні. Паводле афіцыйных даных, прыведзеных НКА рэспублікі, неахопленымі вучобай у школах засталося звыш 85 000 дзяцей школьнага ўзросту [3, л. 30].

На пачатак 1945/1946 вучэбнага года ў параўнанні з папярэднім узрасла і колькасць настаўнікаў, працуючых у агульнаадукацыйных школах. Калі ў канцы 1944/1945 вучэбнага года іх налічвалася 35 036 чалавек, то ў пачатку 1945/1946 вучэбнага года ў школах працавалі 41 443 настаўнікі. Такім чынам, колькасны склад педагагічных кадраў, якія забяспечвалі вучэбны працэс у школах, узрос на 6407 чалавек, або на 18,2%. Трэба адзначыць, што павелічэнне ў асноўным адбылося за лік асоб, якія не толькі не мелі педагагічнай адукацыі, а нават сярэдняй. З агульнай колькасці працуючых настаўнікаў не мелі педагагічнай адукацыі 16 936 чалавек, або 40%. Як правіла, гэта былі настаўнікі сельскіх пачатковых школ. Якасны склад педагагічных кадраў палепшыўся за лік настаўнікаў, дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі, і выпускнікоў сярэдніх і вышэйшых педагагічных вучэбных устаноў. Калі ў канцы 1944/1945 вучэбнага года ў школах рэспублікі працавалі 2414 настаўнікаў з вышэйшай педагагічнай адукацыяй і 18 113 – з сярэдняй педагагічнай адукацыяй, то ў 1945/1946 навучальным годзе колькасць першых склала 2940, другіх – 21 567 чалавек. Павелічэнне колькасці настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй склала 526 чалавек, або 22%, з сярэдняй педагагічнай адукацыяй – 3454 чалавекі, або 19% [3, л. 70]. Тым не менш школы рэспублікі адчувалі вострую патрэбу ў настаўніках. У Мінскай вобласці не хапала 322 настаўнікаў пачатковых класаў, 20 – рускай літаратуры, 16 – матэматыкі і фізікі, 9 – геаграфіі, 6 – хіміі і прыродазнаўства і інш. [5, л. 32]. Асабліва востры недахоп педагагічных кадраў адчуваўся ў школах заходніх абласцей. Так, у Пастаўскім, Юрацішскім, Ашмянскім раёнах Маладзечанскай вобласці не хапала адпаведна 76, 113 і 96 настаўнікаў [3, л. 71]. Па гэтай прычыне ў шэрагу школ вучэбныя заняткі пачаліся са спазненнем на 2–3 месяцы [3, л. 30].

Падводзячы вынікі работы школ і органаў народнай адукацыі за першае паўгоддзе 1945/1946 вучэбнага года, калегія НКА прызнала нездавальняючым і стан школьнага будаўніцтва ў 1945 г. З выдзеленых урадам на ўзвядзенне школьных аб'ектаў рэспублікі 28 млн 350 тыс. руб. за год было асвоена толькі 10 млн руб., што складала 36% ад агульнай колькасці выдаткаваных бюджэтных сродкаў. «З зацверджаных планам 132 аб'ектаў у эксплуатацыю было здадзена толькі 22 будоўлі, па 41 будоўлі работы былі выкананы на 40–80%, па 28 будоўлях работы выкананы толькі на 20–40%, а па 41 будоўлі будаўнічыя работы зусім не пачаты», – адзначалася ў пастанове калегіі НКА БССР [3, л. 21].

Не лепш ішлі справы ў рэспубліцы ў 1945 г. і з рамонтам школьных будынкаў і памяшканняў. Праз адсутнасць будаўнічых матэрыялаў (фарбы, вапны, шкла), рабочых рук у многіх школах праводзіўся не капітальны, а толькі касметычны рамонт, прычым не ў поўным аб'ёме і нізкай якасці. Практычна ва ўсіх абласцях па прычыне затрымкі рамонтных работ

школы пачалі вучэбны працэс значна пазней за 1 верасня. Так, у Гродзенскай вобласці 42 школы адкрыліся толькі на працягу кастрычніка і лістапада [5, л. 2].

У выніку дрэннай пастаноўкі будаўнічых і рамонтных работ большасць агульнаадукацыйных школ рэспублікі вымушана была ў 1945/1946 вучэбным годзе выкарыстоўваць галоўным чынам прыстасаваныя прыватныя, наёмныя, як правіла, без належнага рамонту памяшканні, а падчас нават зямлянкі. У Полацкай вобласці толькі 177 школ (21,5%) з 825 пачалі вучэбны год ва ўласных будынках. 281 школа размяшчалася ў прыстасаваных памяшканнях, 336 – у наёмных, 31 школа ў якасці вучэбнага памяшкання выкарыстоўвала зямлянкі (Полацкі раён – 3, Асвейскі – 21, Расонскі – 6, Ушацкі – 1) [5, л. 174]. У Мінскай вобласці з 1186 дзеючых школ 213 размяшчаліся ў прыстасаваных памяшканнях, 443 – у наёмных і 3 школы ў Бягомльскім раёне працавалі ў зямлянках [5, л. 27].

У першы пасляваенны вучэбны год агульнаадукацыйныя школы рэспублікі адчувалі вострую патрэбу ў школьнай мэблі і абсталяванні, падручніках, наглядных дапаможніках, школьна-пісьмовых прыналежнасцях, не хапала сшыткаў, алоўкаў, пёраў, без якіх было складана правесці ўрок. Глобус, геаграфічныя або гістарычныя карты былі вельмі рэдкімі. Настаўніку часта даводзілася ісці на ўрок толькі з крэйдай.

Трэба адзначыць, што партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва рэспублікі ў пасляакупацыйныя гады неаднаразова прымала пастановы, якія прадугледжвалі шэраг мерапрыемстваў па паляпшэнні вучэбна-матэрыяльнага забеспячэння школ, выкананне якіх даручалася адпаведным камісарыятам. Аднак, як сведчаць архіўныя матэрыялы, прынятыя пастановы выконваліся не ў поўнай меры або не выконваліся зусім. Так, школы Палескай вобласці ў пачатку 1945/1946 вучэбнага года, маючы патрэбу ў 43 592 стандартных партах, не атрымалі ніводнай і вымушаны былі абыходзіцца прыстасаванай нестандартнай мэбляй [5, л. 71]. Школам Гродзенскай вобласці на пачатку 1945/1946 вучэбнага года патрабавалася 12 008 парт, а было атрымана імі толькі 2735, патрабавалася 1042 класныя дошкі, было атрымана – 278 [5, л. 3].

У гэтых умовах пэўная колькасць школьнай мэблі і абсталявання ў 1945 г. была выраблена гаспадарчым спосабам. У прыватнасці, такім спосабам для агульнаадукацыйных школ Мінскай вобласці было змайстравана 5080 стандартных парт, 746 класных дошак, 1560 столікаў, 713 табурэтак. Аднак гэта толькі ў нязначнай меры выграшала існуючую праблему [5, л. 28].

Забяспечанасць школ падручнікамі ў першы пасляваенны год была выключна нездавальняючая. Так, школамі Мінскай вобласці ў першым паўгоддзі было атрымана 28 найменняў падручнікаў агульнай колькасцю 130 271 экзэмпляр. На ўвесь Бягомльскі раён былі толькі 2 падручнікі па геаграфіі для 7-га класа, 1 буквар прыходзіўся на двух вучняў [5, л. 28].

Крайне нездавальняюча былі забяспечаны школы і пісьмова-канцэлярскімі прыналежнасцямі. На школы Палескай вобласці ў першым паўгоддзі было выдзелена 621 580 сшыткаў, па адным алоўку і пяру на вучня [5, л. 72]. Мінскай вобласцю ў першым паўгоддзі было атрымана 1056 тыс. сшыткаў, што дазволіла выдаць у сельскай мясцовасці па 6 сшыткаў кожнаму вучню [5, л. 29].

Па прычыне дрэннай забяспечанасці школ дровамі для ацяплення ў класных пакоях было холадна. Дзеці на ўроках падчас працавалі ў вопратцы і рукавіцах. У вялікія марозы заняткі ў школах наогул прыпыняліся [5, л. 127].

У большасці школ (а ў сельскай мясцовасці практычна ва ўсіх) у якасці крыніцы асвятлення выкарыстоўваліся газавыя лямпы. Так, у Гродзенскай вобласці з 823 школ толькі 23 асвятляліся электрычным святлом, астатнія 800 працавалі пры лямпавым асвятленні [5, л. 3]. Па прычыне адсутнасці лямп, газы апошнія ўрокі ў сельскіх школах сістэматычна зрываліся.

Дрэннае вучэбна-матэрыяльнае становішча школ, нездавальняючыя ўмовы навучання, нізкі прафесійны ўзровень настаўнікаў негатыўна сказваліся на арганізацыі вучэбнага працэсу і, як вынік, на паспяховасці навучэнцаў. Аб гэтым сведчаць адзнакі апошніх, атрыманыя па выніках першага паўгоддзя 1945/1946 вучэбнага года. У Гомельскай вобласці з 2066 навучэнцаў 8–10 класаў адзнакі «4» і «5» атрымалі толькі 24 вучні, адзнаку «3» – 762, адзнаку «2» атрымалі 1280 вучняў, або 57% ад агульнай колькасці навучэнцаў. У Баранавіцкай вобласці з 2090 навучэнцаў 8–10 класаў адзнакі «4» і «5» не атрымаў ніхто [3, л. 53].

Задача па ахопе навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту, якая ставілася перад агульнаадукацыйнай школай «сталінскім законам аб усянавучы» ў 1945/1946 вучэбным годзе, таксама аказалася нявыкананай. Згодна са статыстыкай, прадстаўленай ў НКА рэспублікі абласнымі аддзеламі адукацыі, у Віцебскай, Пінскай, Гродзенскай абласцях адпаведна не былі ахоплены вучобай 4141, 4010 і 3097 дзяцей школьнага ўзросту [3, л. 30]. Праведзеная камісіяй НКА праверка стану выканання школамі рэспублікі закону аб усянавучы выявіла, што даныя, прадстаўленыя абласнымі аддзеламі адукацыі, заніжаныя ў некалькі разоў. Так, у Гродзенскай вобласці дзяцей школьнага ўзросту, не ахоп-

леных вучобай, аказалася не 3097, а каля 13 000 [3, л. 51]. Скажэнне статыстыкі па ўсянавучы тлумачыцца тым, што дырэктары школ, баючыся рэпрэсій з боку вышэй стаячых структур, утойвалі сапраўднае становішча з ахопам навучаннем дзяцей школьнага ўзросту і паказвалі ў справаздачах значна заніжаныя даныя.

Істотным стымулюючым фактарам актывізацыі працэсу пасляваеннага аднаўлення і далейшага развіцця сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі рэспублікі павінен быў стаць Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946–1950 гг., зацверджаны Вярхоўным Саветам БССР 11 верасня 1946 г. У ім, у прыватнасці, прадугледжвалася значна пашырыць і аптымізаваць сетку агульнаадукацыйных школ; удасканаліць іх вучэбна-матэрыяльную базу; завяршыць усеагульнае абавязковае пачатковае і прыступіць да ўсеагульнага сямігадовага навучання дзяцей як у горадзе, так і на сяле.

Фактычна прыняты закон ставіў перад школьнай адукацыяй рэспублікі тыя ж задачы, якія яна не здолела вырашыць у адпаведнасці з прынятымі пастановамі СНК БССР і ЦК КП(б)Б па падрыхтоўцы школ да 1944/1945 і 1945/1946 вучэбных гадоў.

У наступным 1946/1947 вучэбным годзе сетка школ рэспублікі прадоўжыла свой рост, у параўнанні з 1945/1946 вучэбным годам яна павялічылася на 403 адзінкі. Усяго ў рэспубліцы працавала 11 365 агульнаадукацыйных устаноў. З іх пачатковых 9200, сямігадовых – 1792 і сярэдніх – 373 [6, л. 2]. Перад пачаткам 1946/1947 вучэбнага года пэўная работа была праведзена і па паляпшэнні матэрыяльна-гаспадарчай і вучэбнай базы школ. На працягу летніх месяцаў метадам народнай будоўлі было пабудавана 765 і адрамантавана 9145 школьных будынкаў, выраблена і перададзена школам 47 000 парт, 3500 класных дошак, 6000 класных сталоў і іншага гаспадарчага і вучэбнага інвентару [6, л. 3]. Аднак тэмпы школьнага будаўніцтва ў рэспубліцы нельга было прызнаць здавальняючымі. Толькі 4056 школ з 11 365, або 35% ад агульнай колькасці, размяшчаліся ў тыпавых школьных будынках. У той жа час каля 4500 школ працягвалі працаваць у сялянскіх хатах і звыш 2800 – у іншых непрыстасаваных памяшканнях [6, л. 8].

Кантынгент навучэнцаў агульнаадукацыйных школ у 1946/1947 вучэбным годзе таксама ўзрос і дасягнуў 1 402 358 чалавек. Пры гэтым не ахопленымі навучаннем засталіся 40 170 дзяцей школьнага ўзросту. З іх 12 606 дзяцей, якія павінны былі ўпершыню пайсці ў школу [6, л. 8]. Рост кантынгенту навучэнцаў перавышаў тэмпы росту сеткі школ. Па гэтай прычыне толькі 1347 школ (12% ад агульнай колькасці) працавалі ў адну змену, 9957 школ (амаль 88%) з ахопам 812 906 навучэнцаў працавалі ў дзве змены, а 61 школа вымушана была працаваць у тры змены [6, л. 8].

Пэўныя станоўчыя змены адбыліся і ў настаўніцкім складзе школ. Кантынгент педагагічных кадраў агульнаадукацыйных школ у параўнанні з папярэднім годам павялічыўся на 2168 чалавек. Агульная колькасць працуючых у школе настаўнікаў склала 47 699 чалавек. Якасны склад палепшыўся ў асноўным за кошт выпускнікоў педагагічных вучылішчаў, настаўніцкіх і педагагічных інстытутаў [6, л. 79].

На працягу вучэбнага года школамі было атрымана 4 502 000 экзэмпляраў падручнікаў. Агульны іх фонд дасягнуў 7 822 832 экзэмпляраў. Аднак такая колькасць ні ў якім разе не задавальняла патрэбы школ [6, л. 4].

Некалькі лепш у 1946/1947 вучэбным годзе былі справы з забеспячэннем школ пісьмова-канцылярскімі прыналежнасцямі. Школы атрымалі 36 490 сшыткаў, 7200 алоўкаў, 11 200 штук пёраў, 1170 вучнёўскіх ручак і інш.

Пашырэнне сеткі школ, паляпшэнне матэрыяльна-гаспадарчай і вучэбнай базы, павелічэнне колькаснага і якаснага настаўніцкага складу безумоўна станоўча сказаліся на якасці вучэбна-выхаваўчай работы агульнаадукацыйных школ. Так, 200 выпускнікоў па выніках выпускных экзаменаў былі ўзнагароджаны залатымі і сярэбранымі медалямі. У папярэднім 1945/1946 вучэбным годзе ўзнагароджаных медалямі было толькі 76 чалавек [6, л. 18].

**Заключэнне.** Аналіз архіўных матэрыялаў дае падставу канстатаваць, што ў першыя пасляваенныя гады раённымі партыйна-савецкімі органамі, раённымі і гарадскімі аддзеламі народнай адукацыі, грамадскасцю, настаўнікамі і вучнямі было шмат зроблена для аднаўлення нармальнай работы агульнаадукацыйных школ рэспублікі, але пытанні будаўніцтва і рамонту школ, іх матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, усянавуча, забеспячэння школ настаўніцкімі кадрамі, вучэбнай літаратурай і вучэбна-наглядными дапаможнікамі, школьна-пісьмовымі прыналежнасцямі заставаліся актуальнымі і патрабавалі свайго вырашэння.

## Спіс літаратуры

1. Андарала І. А. Аднаўленне школьнай адукацыі ў Беларусі ў 1943–1945 гг. // Весці БДПУ. Сер. 2. 2020. № 2. С. 12–17.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 42сч. Воп. 6. Спр. 6.

3. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 43.
4. НАРБ. Ф. 42сч. Воп. 6. Спр. 5.
5. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 40.
6. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 102.

## References

1. Andarala I. A. Restoration of school education in Belarus in 1943–1945. *Vesti BDPU* [Bulletin of the Belarusian State Pedagogical University], series 2, 2020, no. 2, pp. 12–17 (In Belarusian).
2. National Archives of Republic of Belarus (NARB). Fund 42п. I. 6. F. 5.
3. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 43.
4. NARB. Fund 42п. I. 6. F. 5.
5. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 40.
6. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 102.

## Інфармацыя пра аўтара

**Андарала Ігар Аляксандравіч** – кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: aia1106@mail.ru

## Information about the author

**Andarala Igar Alexandrovich** – PhD (Pedagogics), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic Belarus). E-mail: aia1106@mail.ru

*Пастуніў 10.03.2021*